**М. М. Воінава-Страха**

# ВІДЫ ЭКЗІСТЭНЦЫЙНЫХ МАДЭЛЕЙ У МАЛОЙ ПРОЗЕ А. БРАВА І Д. ЛЕСІНГ

Канцэптуальнасць і маштабнасць творчай спадчыны мастака слова, як слушна заўважыў айчынны літаратуразнаўца П. Васючэнка, вызначаецца яго ўнікальнай магчымасцю не толькі «алітаратурвання» жыцця, але і пераства-

рэння, мадэлявання чалавечых лёсаў. Існаванне літаратурных герояў у цесным узаемадзеянні з хранатопам у рамках мастацкага твора *пры наяўнасці абагульнення, іншасказальнасці і некаторай фармалізацыі выглядае як экзістэнцыйная мадэль* (П. Васючэнка). Навукоўца вылучае наступныя віды мадэлей існавання: лінейная (падарожжа, шлях), цыклічная (кола), дыскрэтная (прарыў кола), энтрапічная (разлад), новарамантычная ці вертыкальная (палёт).

Творчасць англійскай пісьменніцы, лаўрэата Нобелеўскай прэміі Дорыс Лесінг і прадстаўніцы беларускага мастацтва слова Алены Брава вылучаецца спецыфікай стварэння «жаночых» экзістэнцыйных мадэлей. Увага аўтараў скіравана на даследаванне ў мастацкай прасторы тоеснай праблемы – існаванне гераінь у сітуацыі, калі асобаснае «я» знаходзіцца ў няспыннай канфрантацыі з сацыяльна абумоўленымі стэрэатыпнымі формамі жаночай самарэалізацыі. Як вынік, і Д. Лесінг, і А. Брава дэманструюць шляхі пошуку балансу быцця ва ўмовах, якія вымагаюць вырашэнне шэрагу жыццёва значных пытанняў: адказнасць за сваю і чужую будучыню, усведамленне каштоўнасці ўласнага існавання і важнасці сямейна-родавай пераемнасці, пераасэнсаванне зместу быцця на розных каардынатах прасторава-часавага вымярэння, неабходнасць змагання за права выжыць, адчужанасць і адзінота ў соцыуме і інш.

Так, Д. Лесінг звяртаецца да аналізу жаночай экзістэнцыі ў яе эвалюцыі. Зыходны пункт гэтага працэсу прадстаўлены ў навеле To room nineteen. Жыццёвая лінія галоўнай гераіні разгортваецца ў традыцыйным рэчышчы ў адпаведнасці з базавымі складнікамі аксіялагічнай сістэмы, згодна з якімі сям’я і працяг роду з’яўляюцца аднымі з найважнейшых чалавечых каштоўнасцяў. Гераіня заключае шлюб у тым узросце, калі сфармавана не толькі аб’ектыўнае ўсведамленне сваіх дзеянняў, але і гатоўнасць несці за іх адказнасць.

Англійская пісьменніца стварае рэалістычна дакладную карціну, няспынна акцэнтуючы ўвагу на грунтоўнасці жыццёвай пазіцыі, сацыяльным статусе кожнага з персанажаў, нібы імкнучыся тым самым прадставіць аб’ектыўную доказную базу трываласці фундаменту іх шлюбу. Чым мацней аўтар падкрэслівае, што *everything right, appropriate, and what everyone would wish for, if they could choose*, тым выразней кантраст паміж знешнімі «збалансаванымі» ўмовамі і нарастаючай унутранай драмай гераіні.

Сям’я і дзеці з’яўляюцца важным складнікам і ў мастацкай аксіялагічнай сістэме А. Брава. Менавіта з прычыны татальнай засяроджанасці на жыцці свайго сына і вострага жадання стварыць спрыяльныя ўмовы для працягу роду ў асобе роднай унучкі застаецца без шанца на выжыванне Валянціна, гераіня навелы «Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца». Імкненне забяспечыць дабрабыт хвораму сыну Ігнату, паглыбленасць у штодзённыя побытавыя клопаты не дазваляюць раскрыцца асобасным якасцям гераіні навелы «Яснай раніцай у Пінар-дэль-Рыо». Вымушана падпарадкоўвацца ўсталяванай сістэме абавязкаў нават свабодалюбівая гераіня навелы «Круп-нік для музы».

Істотнае значэнне для раскрыцця спецыфікі жаночай экзістэнцыі ў творчасці абедзвюх пісьменніц мае асэнсаванне той мяжы, калі паняцце сям'і як аксіялагічнага складніка, прызначанага гарманізаваць чалавечы ўніверсум, пераўтвараецца ў фактар не толькі дэстабілізуючы, але і дэструктыўны па сваёй сутнасці. Бясспрэчна, навідавоку парадаксальнасць дадзенай з'явы, бо сям'я з'яўляецца адной з быційных першаасноў і яе стваральны пачатак аксіёматычны. Разам з тым, унутраная драма гераінь і А. Брава, і Д. Лесінг напрамую звязана з іх уключанасцю ў сямейную прастору. З кантэксту твораў вынікае, што сям'я як сацыяльная з'ява і ў англійскай, і беларускай нацыянальных прасторах абумоўлівае замкнёнасць характару жаночай экзістэнцыйнай мадэлі. Менавіта маці/жонка выконвае ролю цэнтраўтваральнага звяна, парушэнне якога можа адмоўна паўплываць на трываласць сям'і як сістэмы: *Susan's practical intelligence for the sake of Matthew, the children, the house and the garden, – which unit would have collapsed in a week without her.*

Мяжа, пераход за якую можа быць небяспечным і нават фатальным, узнікае як вынік працэсу растварэння асобаснага «я», калі ролі маці/жонкі спачатку выцясняюць, а з цягам часу і замяняюць тое ядро, якое безадносна да гендарнай ролі фарміруе індывідуальнасць і ўнікальнасць чалавека.

Як бачым, і ў мастацкай прасторы А. Брава (напр., «Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца»), і ў некаторых творах Д. Лесінг (напр., «Пакой 19») назіраецца свядомая падмена жыццяў – свайго і дзяцей. Разам з тым, гераіні робяць крок наперад у асобасным развіцці і спрабуюць засяродзіцца на пошуку ісціны, схаваных сэнсаў быцця. Нягледзячы на выразнае жаданне вырвацца з кола паўсядзённых «жаночых» абавязкаў і вымушанай залежнасці экзістэнцыйная мадэль гераінь навел А. Брава набывае замкнёны характар. Шлях да выйсця цяжка заўважыць нават у выпадку атрыманай свабоды (Homo vitreus), бо замест палёгкі яна становіцца нечым «самым цяжкім у жыцці», «быццам правалілася ў бездань». Працэс усеагульнай энтрапіі непазбежны, што дазваляе вылучыць не толькі цыклічную, але і энтрапічную мадэлі экзістэнцыі.

Тым не менш, у адрозненні ад А. Брава, у Д. Лесінг назіраецца выразная тэндэнцыя да дыскрэтнай экзістэнцыйнай мадэлі, якая праяўляецца ў прарыве сацыяльна-стэрэатыпнага кола жаночага існавання. Так, гераіні зборніка апавяданняў "Бабкі" дэманструюць адасабленне ад традыцыйна прынятых спосабаў рэалізацыі прадстаўніц "слабога" полу, сцвярджаючы магчымасць паўнавартаснага жыцця па-за шлюбнай сувяззю, выходзячы нават часам за рамкі прынятых нормаў маралі.

Такім чынам, агульным у мастацкай прасторы Д. Лесінг і А. Брава з'яўляецца рэалізацыя тоеснай энтрапічнай (разлад) і цыклічнай (замкнёнае кола) жаночых экзістэнцыйных мадэлей. Няспынная тэндэнцыя да самаідэнтыфікацыі і незалежнага волевыяўлення выводзіць гераінь Д. Лесінг на эвалюцыйны віток развіцця і з цягам часу знаходзіць выражэнне ў новай

мадэлі – дыскрэтнай (прарыў замкнёнага кола). Аналагічныя праявы ў раскрыцці жаночых вобразаў у А. Брава дазваляюць адзначыць толькі спарадычныя праявы выхаду на дадзены ўзровень асобаснай экзістэнцыі.